Здароўя і шчасця жадаем мы ўсім на Новы 2000-ы год!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 18 (974) | АЎТОРАК, 28 снежня 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная




## ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Сёння мы звяртаемся да Вас як да прадстаўнікоў таго пакалення, каму пашчасціла жыць і працаваць на сумежжы двух стагоддзяў і 2000-годдзя хрысціянства. І ўжо зусім блізка той час, калі мы ўступім у новае, трэцяе тысячагоддзе цяперашняга летазлічэння.

Гэтыя даты шырока адзначаюцца ва ўсім свеце. Яны абавязваюць належным чынам прасачыць усе этапы грамадскага развіцця, з найлепшымі спадзяваннямі і аптымізмам зазірнуць у будучыню.

А пакуль што мы развітваемся з адыходзячым у гісторыю 1999 годам. Для розных краін і народаў ён быў не аднaзначным, хоць мэта ставілася адна — дасягненне далейшага прагрэсу ва ўсіх сферах жыццядзейнасці.

У вельмі складаных умовах гэта праблема вырашалася ў нашай краіне. Вызначаныя рубяжы пераадолены не па ўсіх сацыяльна-эканамічных паказчыках. Аднак некаторыя зрухі ў лепшы бок сталі відавочнымі і адчувальнымі. Вельмі важным для нас стала падпісанне Дагавору аб стварэнні Саюза з вялікім братнім народам Расіі.

1999 год стаў адметнай вяхой і для нашага універсітэта. У пачатку кастрычніка ён адзначыў свой 70-гадовы юбілей. Прызнаннем высокіх заслуг вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся стала прысуджэнне ГДУ Ганаровага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, а яго калектыву — Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу нашай краіны. Рэктар універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар Л.А.Шамяткоў удастоены падзякі Прэзідэнта А.Р.Лукашэнкі, а плённая навукова-педагагічная дзейнасць загадчыкаў кафедр дактароў навук, прафесараў Д.Р. Ліна і І.В.Максімея адзначана медалямі "За працоўныя заслугі", А.А. Станкевіч — медалём Францыска Скарыны.

Вялікая група вучоных, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, гомельскім аблвыканкома і абласнога Савета дэпутатаў, значком "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь", Ганаровымі граматамі і Граматамі Міністэрства адукацыі краіны, гомельскіх гарвыканкома і гарадскога Савета дэпутатаў, адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля, некаторых рэспубліканскіх ведамстваў, прафсаюзных органаў.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, працягваўся рост навуковага патэнцыялу універсітэта. Яго выкладчыкамі абаронены 2 доктарскія і больш 10 кандыдацкіх дысертацый, з'явілася нямала новых навуковых публікацый, актыўна працягвалася работа па далейшаму ўдасканаленню навучальнага працэсу і павышэнню якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.



У новым, 2000-ым годзе наша галоўная задача — дабіцца яшчэ больш высокіх паказчыкаў па ўсіх напрамках дзейнасці універсітэта. Для гэтага выкарыстаем усе свае рэзервы, накоплены вопыт, прыкладзем максімум намаганняў.

*Горача віншуем усіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў з надыходзячым Новым, 2000-ым годам. Прыміце нашы найлепшыя пажаданні для здзяйснення вашых асабістых планаў і задум. Плённай вам працы і выдатнай вучобы на карысць нашай незалежнай і суверэннай рэспублікі, моцнага здароўя, асабістага дабрабыту!*

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**



Кафедра-юбіляр

## У НАГУ З ЧАСАМ

30-га снежня спаўняецца 20 гадоў з дня ўтварэння кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі. За гэты час ёй падрыхтавана звыш 500 спецыялістаў у галіне сучасных камп'ютэрных тэхналогій.

Цяпер кафедра мае выдатную матэрыяльна-тэхнічную базу: 27 сучасных камп'ютэраў, уласны кафедральны вылічальны цэнтр з лакальнай сеткай, разнастайнае перыферыйнае камп'ютэрнае абсталяванне, лабараторыі, што дазваляе рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў па двух спецыялізацыях – "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі графічнай інфармацыі" і "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі ў радыёэлектроннай прамысловасці".

Кафедра з'яўляецца адзінай у Гомельскай вобласці, хто рыхтуе спецыялістаў у галіне камп'ютэрных тэхналогій з глыбокім веданнем як апаратнай часткі, так і праграмнага забеспячэння. А з сёлетняга года для патрэб абласнога камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні пачата падрыхтоўка кадраў у галіне апрацоўкі графічнай інфармацыі. Выкладчыцкі калектыў кафедры АСАІ (з 11 штатных яе выкладчыкаў – 7 кандыдатаў тэхнічных навук) першы ва універсітэце пачаў распрацоўку новага вучэбнага плана спецыяльнасці АСАІ ў адпаведнасці з дзяржстандартам Рэспублікі Беларусь.

Наступнае стагоддзе немагчыма ўявіць без выкарыстання сучасных камп'ютэраў і сістэм перадачы дадзеных, таму наперадзе калектыў кафедры чакаюць новыя ідэі, падыходы ў падрыхтоўцы яшчэ больш высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Перад юбілеем кафедры адбылася знамянальная падзея: пасляхова абараніла кандыдацкую дысертацыю першая яе аспірантка — асістэнт Ірына Уладзіміраўна Агеенка (навуковы кіраўнік заг. кафедры к.т.н., дацэнт А.М. Дзямідзенка). Добры пачын зроблены.

Міласэрнасць

## ПАДАРЫЛІ СВЯТА

*от сердца к сердцу*

...Іх вачаняты, цікаўныя і дапытлівыя, свяціліся сапраўдным шчасцем. Моцна прыціскаючы да сябе рознакаляровыя, прыгожа аздобленыя наборы з цацкамі, кнігамі, навагоднія падарункі — цукеркі, хлопчыкі і дзяўчынкі з захапленнем сачылі за ўсім, што адбывалася тут, у выставачнай зале ГДУ. Сюды іх, дзяцей-сірот, з няпоўных і шматдзетных сем'яў, запрасілі на дабрачынную ёлку члены студэнцкага таварыства "Сябар дзяцей", студэнты — будучыя педагогі, вучні СШ № 44, каб падарыць сапраўднае свята. А для гэтага было зроблена ўсё: ад уручэння ім Дзедам Марозам і Снягуркай падарункаў да стварэння той казачнай, вясёлай, радаснай атмасферы, у якой змаглі адагрэцца дзіцячыя маленькія сэрцы.

Традыцыйная дабрачынная пераднавагодняя акцыя Беларускага дзіцячага фонду "Нашы сэрцы — хворым дзецям" узяла пачатак у ГДУ 16 снежня. Яшчэ да гэтай даты пад зіхатлівую навагоднюю ёлачку, якая заняла цэнтральнае месца ў выставачнай зале універсітэта, прыносілі студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі ГДУ, а таксама вучні школ горада розныя цацкі, кніжкі, а таксама разнастайныя вырабы, зробленыя з любоўю сваімі рукамі, каб яны потым знайшлі сваіх адрасатаў — выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, хворых дзяцей.

Свае матэрыяльныя ўкладанні зрабілі для правядзення дабрачыннай ёлкі прафкомы універсітэта — выкладчыкаў і супрацоўнікаў, студэнтаў.




А работнікі універсітэцкай сталовай спаўна праявілі сваё выдатнае кулінарнае майстэрства: для дзяцей — удзельнікаў дабрачыннай ёлкі спяклі прыгожы і смачны торт, якім маленькія госці з апетытам паласаваліся. Цікавыя, вясёлыя канцэртныя нумары падрыхтавалі для іх і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці культурнага цэнтра ГДУ.

Цяжка пераацаніць важнасць такіх акцый для абяздоленых дзяцей, у час якіх людзі з адкрытым сэрцам і душой дораць ім цяпло, радасць, пяшчоту і ўвагу.

Усе жадаючыя могуць ўнесці і свой уклад у гэтую высакародную справу. Можна прыносіць да навагодняй ёлкі ў выставачнай зале універсітэта ўсемагчымыя падарункі, якія потым будуць уручаны дзецям па прызначэнню.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## ЧАКАЕ ЛЯСНАЯ ПРЫГАЖУНЯ



*Дзед Мароз і Снягурка запрашаюць дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта закружыць у вясёлым, шумным карагодзе вакол лясной прыгажуні-ёлкі на навагоднім ранішніку. Ен адбудзецца **2 студзеня ў вучэбным корпусе № 1, у фае актавай залы.***

*Хлопчыкаў і дзяўчынак чакае цікавая забаўляльная праграма: гульні, атракцыёны, выступленні маленькіх удзельнікаў свята, уручэнне падарункаў.*

*Пачатак — у 11 гадзін.*

## Чым памятны быў адыходзячы год?

*У клопатах кожнага дня мы не заўважаем, якім хуткацечным з'яўляецца наша жыццё. А калі на календары застаюцца апошнія лісткі, шчыра здзіўляемся, як жа безупынна бяжыць час. Вось ужо і новае стагоддзе на парозе, якое нам уяўляецца нейкім па-асабліваму загадкавым, таямнічым, невядомым. І хочацца хутчэй даведацца, якім жа яно будзе для людзей, што ім прынясе? Канешне, кожны жыве надзеяй, што будзе ў ім толькі самае добрае, лепшае, каб жыццё наша, нарэшце, стала больш шчаслівым і заможным. А пакуль азірнемся назад, успомнім, што было добрага і ў адыходзячым, апошнім годзе XX стагоддзя. Нездарма ж яшчэ мудрацы казалі: "Варта азірнуцца назад, каб потым ісці далей..."*.

# НАВУКОВАМУ ПОШУКУ НЕ СПЫНЯЦЦА...

Год 1999-ы, які адлічвае свае апошнія гадзіны, для кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта кафедры агульнай фізікі, намесніка дэкана фізічнага факультэта Сяргея Анатольевіча Хахомава быў па-асабліваму цікавым і плённым. Неаднойчы давялося маладому вучонаму збіраць свой чамадан для няблізкіх замежных камандзіровак. Спачатку — у далёкую Канаду, дзе ва універсітэце г.Таронта праходзіла XXVI Генеральная асамблея Міжнароднага саюза рыдыёфізічных навук (URSI). Трапіць туды ў якасці яе ўдзельніка было няпроста. Напачатку неабходна было атрымаць перамогу ў сусветным конкурсе сярод маладых вучоных у галіне радыёфізічных навук. Сяргей Анатольевіч здолеў гэта зрабіць з поспехам і прадстаўляў Рэспубліку Беларусь на гэтай асамблеі ў ліку 50 краін свету. Два даклады, з якімі ён выступіў у Таронта, прысвячаліся электрадынаміцы новых комплексных кампазітных матэрыялаў. Яны з'явіліся абагульненнем вынікаў тых даследаванняў, якія ён выконваў пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры агульнай фізікі доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Ігара Валянцінавіча Семчанкі сумесна з вучонымі Беларусі, Германіі і Фінляндыі.

У родны Гомель, ва універсітэт ён вярнуўся з дыпломам пераможцы конкурсу маладых вучоных, які ўручыў яму ў далёкай Канадзе Прэзідэнт Міжнароднага Саюза радыёфізічных навук Том Сеніёр.

Перапынак перад новай вандроўкай у замежжа працяглым не быў. На гэты раз С.А.Хахомава чакала навуковая стажыроўка ў Фінляндыі. Ён праходзіў яе на працягу месяца ў лабараторыі электрадынамікі сталічнага тэхналагічнага універсітэта, дзе пазнаёміўся з арганізацыяй і спецыфікай навуковай і вучэбнай работы аднаго з буйнейшых і старэйшых універсітэтаў гэтай скандынаўскай краіны. Сяргей Анатольевіч выступіў таксама з дакладам на міжнароднай навуковай канферэнцыі 24-га Нацыянальнага з'езда радыёфізікаў, які праходзіў у фінскім горадзе Турку, прачытаў лекцыю для выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў старшых курсаў у лабараторыі электрадынамікі Хельсінскага тэхналагічнага універсітэта. Акрамя навуковай часткі гэтая лекцыя ўтрымлівала звесткі пра Гомельскі дзяржуніверсітэт, яго факультэты, выкладчыкаў, традыцыі і перспектывы развіцця ГДУ.



Па даручэнні прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна на правах намесніка дэкана фізічнага факультэта Сяргей Анатольевіч падпісаў пагадненне аб навуковым супрацоўніцтве паміж фізічным факультэтам ГДУ імя Ф.Скарыны і лабараторыяй электрадынамікі тэхналагічнага універсітэта сталіцы Фінляндыі. У ім прадугледжаны абмен навуковай інфармацыяй, публікацыя сумесных работ, удзел у выкананні навуковых праектаў, розных канферэнцыях.

У межах дадзенага пагаднення аб навуковым супрацоўніцтве нядаўна адбыўся візіт у тэхналагічны універсітэт г.Хельсінкі і загадчыка кафедры агульнай фізікі доктара фізіка-матэматычных навук І.В.Семчанкі.

Уражаннняў, самых лепшых і памятных, аб замежных навуковых камандзіроўках у С.А.Хахомава засталося шмат. А паколькі малады вучоны не спыняецца ў сваім навуковым пошуку, пашырае поле даследаванняў у абранай галіне фізікі, быць новым адкрыццям, знаходкам, цікавым карысным кантактам як з айчыннымі, так і з замежнымі калегамі.

***На здымку:*** **С.А.Хахомаў у час выступлення на Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў г.Турку (Фінляндыя).**

# САМАЕ ЗАПАВЕТНАЕ ЖАДАННЕ

...Паміж шэрых камянёў – безліч белых паперак-запісак. А ў іх – самыя-самыя запаветныя жаданні людзей, давераныя толькі аднаму яму – Усявышняму. Што ў іх, нікому больш не даведацца і, мабыць, таму ў кожнага, каму пашчасціла трапіць сюды, да вядомай усяму свету Сцяны плачу ў Іерусаліме, абсалютная ўпэўненасць і вера ў тое, што гэтыя жаданні абавязкова збудуцца!

Пакінула тут сваё "пасланне" і Святлана з вялікім спадзяваннем на яго здзяйсненне. Аб чым яно, канешне, нікому не сказала, гэта глыбока асабістая яе тайна.



Летнім падарожжам на святую зямлю, у краіну Ізраіль, будзе памятным для Святланы Каган, чацвёртакурсніцы філалагічнага факультэта, адыходзячы ў гісторыю 1999 год. Глыбока сімвалічна, што гэтая вандроўка адбылася напярэдадні юбілейнай даты – 2000-годдзя хрысціянства. Яна з'явілася выдатным падарункам, зробленым блізкімі людзьмі, да яе дня нараджэння. Дзяўчына і дагэтуль жыве ўспамінамі ад усяго ўбачанага там – у краіне каля трох мораў: Міжземнага, Чырвонага, Мёртвага, у двух з якіх мела магчымасць пакупацца. Яна зрабіла экскурсійны тур па самых святых месцах – пабачыла Іерусалім, Віфлеем, Назарэт, якія ўразілі яе саборам Святой Марыі, Храмам заспакаення Багародзіцы, Гефсеманскім садам, ужо названай вышэй Сцяной плачу і інш.

Аб той памятнай паездцы С.Каган вырашыла абавязкова расказаць на старонках нашай універсітэцкай газеты, актыўным пазаштатным аўтарам якой з'яўляецца на працягу ўсіх гадоў свайго студэнцкага жыцця. Наш калектыў увесь гэты час ведае Святлану менавіта як чалавека, які ўмее вельмі добра, удумліва, пранікнёна пісаць свае нататкі, замалёўкі пра студэцкае жыццё, пра яго цікавыя і памятныя падзеі. І калі ў чарговы раз Святлана з'яўляецца на парозе рэдакцыйнага кабінета, мы ведаем, што яна прынесла новы матэрыял, які, як заўсёды, на ўзроўні – па стылю, змесце, актуальны сваёй тэматыкай, цікавы аўтарскай і творчай манерай.

Па-добраму даводзіцца здзіўляцца, які Святлана арганічны чалавек, як усё робіць добра, якасна. Вучоба па спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура і англійская мова" – толькі на "выдатна" з першага курса, што цяпер высока ацэнена на факультэце і ва універсітэце: яна ўдастоена стыпендыі імя Я.Купалы. Была выдатніцай і ў школе, скончыла яе з залатым медалём, і гэтаму не перашкаджалі розныя захапленні – музыкай, спортам (мае разрад па фехтаванні). Аднолькава роўна "даваліся" ёй і дакладныя, і гуманітарныя навукі. Пасля доўгіх ваганняў спыніла свой выбар на апошніх і перайшла з СШ № 43 у СШ № 56 г.Гомеля ў літаратурны клас. Стала пераможцай абласной алімпіяды па беларускай мове, што дало ёй больш шансаў пры паступленні на філфак ГДУ.

— Выдатныя веды самі па сабе не з'яўляюцца, — прызнаецца студэнтка. — Яны даюцца нялёгка, гэта паўсядзённы працэс, а не ад сесіі да сесіі. Лічу: калі нешта робіш, то ўжо так, каб не марнаваць дарэмна час. Важны станоўчы вынік. Атрыманне дыплома аб вышэйшай адукацыі – гэта яшчэ не дасягненне мэты. Важна, з якім багажом ведаў выйдзеш са сцен вну.

Больш за ўсё сярод вучэбных дысцыплін Святлане падабаецца гістарычная граматыка. Тут, лічыць студэнтка, шырокае поле для даследавання. Яна адчувае ў сабе нейкую асаблівую цікавасць і прагу да навуковых пошукаў. Англійскую мову імкнецца таксама вывучыць дасканала, у важнасці добрага валодання ёй пераканалася пад час паездкі ў далёкае замежжа.

...Вельмі любіць дзяўчына навагодняе свята – з пахам лясной прыгажуні-ёлкі і чаканнем ажыццяўлення загаданага жадання. Яно, самае запаветнае, абавязкова павінна ў яе збыцца, бо людзям з багатым, цікавым унутраным светам, як кажуць, і сам Бог дапамагае.

**Т.ДУБЯК.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## НАВІНЫ ВНУ

### ІНСТЫТУТ ПАМЯНЯЕ СТАТУС

У аграрны універсітэт павінен пераўтварыцца Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Аб гэтым ішла размова ў час наведвання названай вну 11 снежня Прэзідэнтам А.Р.Лукашэнкам. Тут мяркуецца адкрыць два новыя факультэты — ветэрынарны і тэхналагічны.

Наданне інстытуту статусу універсітэта дазволіць на якасна новай аснове будаваць узаемаадносіны вучоных з замежнымі калегамі, палепшыць яго матэрыяльна-тэхнічную базу, а значыць, і арганізацыю навучальнага працэсу. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў садзейнічаць вырашэнню гэтых пытанняў.

### У ГОМЕЛЬСКАГА МЕДІНСТЫТУТА – НОВЫ РЭКТАР

На пасаду рэктара Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, згодна пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, зацверджаны 46-гадовы доктар медыцынскіх навук прафесар Сяргей Уладзіміравіч Жаваранак. Да гэтага часу ён узначальваў Віцебскі філіял навукова-даследчага інстытута радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі рэспублікі.

Як вядома многім нашым чытачам, былы рэктар Гомельскага мединстытута і група іншых яго супрацоўнікаў знаходзяцца пад следствам па ўзбуджанай крымінальнай справе за хабарніцтва.

## ШМАТКВЕЦЦЕ ТАЛЕНТАЎ "ЗІМОВАЙ ВЯСЁЛКІ"

Напярэдадні Новага года абласны камітэт БПСМ і камітэт па справах моладзі аблвыканкома арганізавалі і правялі ў грамадска-культурным цэнтры II абласны фестываль студэнцкіх талентаў "Зімовая вясёлка-99" па старонках конкурсных праграм "Ану, першакурснік!", якія прайшлі ў вну вобласці.

Лепшыя творчыя студэнцкія калектывы, каманды КВЗ, тэатры эстрадных мініяцюр прадставілі на ім свае праграмы. Яны змагаліся за вышэйшую ўзнагароду фестывалю — Гран-пры. Нагадаем, што ў мінулым годзе яго ўладальнікам стала каманда нашага універсітэта.

Сёлета, на жаль, пальму першынства ёй утрымаць не ўдалося. На гэты раз "Ніка" дасталася студэнцкім талентам Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.Сухога. Але першакурснікі ГДУ цяпер былі прызнаны лепшымі ў адной з чатырох намінацый фестывалю — "Акцёрскае майстэрства", за што атрымалі салодкі прыз — вялікі смачны торт.

## СЮЖЭТЫ, ЯКІЯ Б НЕ ПАЎТАРЫЛІСЯ

Сёлета вучэбны корпус №5 нашага універсітэта неаднойчы станавіўся аб'ектам для тэлеаператараў. Але зараз мы нагадаем толькі пра два непрыемныя эпізоды, пра якія даведаліся шматлікія тэлегледачы па сюжэтах перадачы "Дэ-факта..." абласнога тэлебачання. У першы раз паведамлялася аб узнікшым пажары ў адной з лабараторый фізічнага факультэта. А зусім нядаўна — аб небяспечнай знаходцы каля гэтага корпуса, якая была выяўлена пры выкананні земляных работ. Яна засталася неўзарванай у грунце ад мінулай вайны і абясшкодзіць яе давялося толькі цяпер.



## НА СТУДЭНЦКАЙ СЦЭНЕ – "ПІНСКАЯ ШЛЯХТА"

"Пінская шляхта" — значнае дасягненне беларускай драматургіі XIX стагоддзя. Высокае майстэрства Дуніна-Марцінкевіча-драматурга, якое выяўляецца ў цікавым займальным сюжэце, жывых характарах, умелым выкарыстанні багаццяў народнай мовы, вызначыла гэтаму твору доўгае жыццё. "Пінская шляхта" і цяпер з поспехам ставіцца на сцэне, карыстаецца папулярнасцю ў гледача.

Менавіта з гэтай прычыны да яе звярнуліся студэнты гр.Б-21 філалагічнага факультэта, якія вельмі ўдала і па-майстэрску дасканала ўжыліся ў характары герояў, у дух таго часу. Спачатку яны паставілі п'есу перад студэнтамі сваёй групы і даверылі ёй вызначыць далейшы лёс свайго выступлення. Канешне, у кожнага гледача было сваё ўражанне, свае адносіны да ўбачанага, і "акцёры" выслухалі кожнага з яго каментарыямі, дапаўненнямі, заўвагамі. Але ж увогуле ўсім спадабалася тое, што яны ўбачылі.

Самі выканаўцы ніяк не падазравалі, што будуць выступаць яшчэ, ды і не адзін раз. Праз некалькі дзён студэнтам першага курса пашанцавала ўбачыць "Пінскую шляхту" у час заняткаў. Усё адбылося вельмі добра, хоць і было шмат хваляванняў, але ж студэнты ўжо ў другі раз спрабавалі сябе, таму было больш упэўненасці, чым упершыню.

Не прайшло і двух дзён, як дзяўчат (у выкананні "Пінскай шляхты" удзельнічалі толькі яны) запрасілі ў СШ № 56 для паказу п'есы старэйшым класам. І там сустрэлі нашых вандроўнікаў вельмі цёпла і шчыра.

Гледачы аказаліся сапраўднымі аматарамі тэатральнага мастацтва. Яны з сур'ёзнасцю аднесліся да ўбачанага, рэагавалі на кожную з'яву, якая адбывалася на сцэне, са смешных момантаў шчыра, не саромеючыся, смяяліся, пляскалі ў далоні ці проста ўсміхаліся. Асабліва ім спадабалася песня, якой завяршаецца выступленне. Увогуле і студэнтам спадабалася працаваць у такой сяброўскай атмасферы.

Выступілі дзяўчаты і ў СШ № 26. На гэты раз ужо амаль не было хваляванняў, усё адбылося добра, весела і лёгка. Школьнікі былі надзвычай уважлівымі, але ж вельмі сур'ёзнымі. Здавалася, яны не ўспрымалі блізка тое, што робіцца на сцэне, але ж былі ўдзячны за выступленне і запрасілі да сябе ў госці яшчэ раз.

На гэтым вандраванне стомленых студэнтаў скончылася. Цяпер трэба больш думаць пра залікі і экзамены, але ж усё, што было, не пройдзе дарэмна.

**А.БУЖАН,**
**студэнтка гр.Б-21**
**філалагічнага факультэта.**



***На здымку:*** **сцэна са спектакля. У ролях: (злева направа) Кручкоў — Н.Кузьмянкова, Пісулькін — Г.Кончыц, дзесяцкі — Т.Носка, Марыся — А.Бужан, Грышка — А.Грышчанка, маці Марысі — А.Кузьміч.**



## КОГДА НАСТУПИТ НОВЫЙ ВЕК?

*На протяжении последних лет часто употребляется выражение "дожить до двухтысячного года". И чем ближе подходит человечество к этому историческому событию, тем большее количество людей волнует вопрос, когда же точно наступит новый век.*

И действительно, когда окончится двадцатое столетие и начнется третье тысячелетие? Тех, кто торопится отметить это событие, мы вынуждены огорчить. Судите сами: каждое десятилетие содержит 10 лет, каждое столетие — 100, понятно, что тысячелетие — 1000 лет. Поэтому первое столетие нашей эры закончилось ровно в полночь с 31 декабря 100 года на 1 января 101 года. Отсюда следует, что двадцатое столетие и одновременно второе тысячелетие нашей эры закончится в полночь, в момент перехода с 31 декабря 2000 года на 1 января 2001 года.

Понятно, что такая логика рассуждений нравится далеко не всем. Да и магия круглых чисел настраивает на упрощенный способ решения проблемы: следующее тысячелетие наступит в момент, когда цифра "2" возглавит новое летоисчисление, значит, с 1 января 2000 года. (Хотя таким подходом мы обкрадываем двадцатый век на целый год!). Появились даже люди, которые упрекают историков в том, что они неправильно называют наше столетие двадцатым. "Реформаторы" всерьез требуют считать текущий век девятнадцатым, так как летоисчисление начинается с числа 19.

Заметим, что обсуждаемая проблема действительно не так проста, как это может показаться с первого взгляда. Ведь, как известно, существует еще и время "до нашей эры". Поэтому напомним, что год — это промежуток времени, за который Земля как планета делает один оборот вокруг Солнца. Значит, то, что произошло в первом году нашей эры (в начале или конце), случилось в период от условного нуля до окончания последнего дня этого года. Поэтому астрономы определяют время (день, месяц, год) как точку на оси времени, которую можно сравнить с миллиметровой линейкой — на ней отсчет также начинается от нуля. Вот почему у астрономов существует ... нулевой год, а первый начинается после его окончания. Следовательно, в исчислении времени они идут на год вперед, чем люди, живущие по обычному календарю!

Из этого следует, что астрономы будут встречать новый век 1 января 2000 года — на год раньше, чем все остальные, так как и в этой древнейшей и интереснейшей науке век длится 100 лет. А значит, приход нового тысячелетия они имеют полное право отмечать дважды! Что, впрочем, сделает и большинство землян, живущих по христианскому календарю.

**Владимир ЛАРИОНОВ,**
**выпускник ГГУ, астроном.**

## 2000-ЫЙ ГОД – ГОД МЕТАЛЛИЧЕСКОГО ДРАКОНА

Китайская культура рассматривает сущность Дракона как совершенство в изменении. Этот мифологический персонаж способен вносить неразбериху и ставить все с ног на голову. Причем проделывает он это для того, чтобы еще больше совершенствовать мир, как это и ни парадоксально звучит. Все старое, изжившее себя, благополучно отойдет в прошлое. Если в семье не было мира, это может привести к разрыву, если со старыми друзьями уже нет прежнего понимания, смело можно заводить новое знакомство. И так во всем.

Предстоящий год объединяет два состояния энергии — земное и небесное, то есть год наиболее благоприятен для совмещения духовных и материальных потребностей. Можно, например, заниматься



любимым делом и одновременно извлекать из этого выгоду. А если ваша специальность больше вас не удовлетворяет, год как нельзя лучше подходит для смены профессий.

## Новогодние приметы

*Как Новый год встретишь — так весь год и проведешь*

Это вполне логично, ведь к Новому году люди стараются переделать все свои дела, подвести черту под сделанным. Мы как бы возлагаем надежды на предстоящий год, ожидаем новых событий, новых высот. И подсознательно выполняем свои ожидания.

*У кого в Новый год будет пусто в карманах, тот весь год проведет в нужде*

Не знаем, на сколько это утверждение правильно. Ведь человек нуждающийся может в любой момент найти высокооплачиваемую работу, получить помощь родственников, наследство. Или это уже из области удачи? На всякий случай положите в карман крупную денежную купюру, вдруг сработает?

*На новогоднем столе должны быть в изобилии еда и напитки, тогда весь год в семье будет достаток*

Тоже вполне справедливо. Если ваш материальный достаток позволяет накрыть стол так, чтобы он изобиловал всяческими разнообразными блюдами, то очень вероятно, что предстоящий год вы проведете в соответствии со своим жизненным уровнем.

*Одалживать деньги под Новый год нельзя ни при каких обстоятельствах, чтобы весь следующий год не быть в долгах*

Чувствуете, как в этой фразе живо воспоминание о всеобщей народной нужде, русский человек и последнее отдаст, а потом весь год будет ходить полуголодным, такова широта нашего характера.

*Перед Новым годом нельзя выносить сор из избы, иначе целый год не будет домашнего благополучия*

Какая игра слов! Не ссорьтесь накануне Нового года, тем более не рассказывайте об этом своим ближайшим родственникам, ссора может плавно перейти в предстоящий год, а там, кто знает, до чего она может довести вашу семью?

*Если на Новый год надеть что-то новое, то наступающий год будет удачным*

Побалуйте себя обновкой в год Металлического Дракона.

## Памятныя сустрэчы ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

Дзяцінства... Маленства... У гэтых словах змяшчаецца нешта самае дарагое для кожнага дарослага чалавека: думкі і мары, бесклапотнасць і смех, радасць жыцця. Але, як вядома, усё некалі канчаецца, праходзіць і пара дзяцінства.

Студэнтам філалагічнага факультэта не так даўно прадставілася магчымасць успомніць сваё маленства, бо для іх была падрыхтавана цікавая сустрэча з самым звычайным казачнікам — А.З.Караленкам з Рэчыцы. Гэта надзвычай цікавы і сапраўды таленавіты чалавек. Яго працоўная дзейнасць звязана з нафтай. Любімая праца падштурхнула пісаць казкі. Анатоль Захаравіч упершыню напісаў казку пра нафту ў 1974 г., якая называлася "Рабяты-медзведзяняты". Потым былі казкі "Дзве прыгажуні", "Марскі лёс", "Зінга — царыца змеяў", "Ганарысты індык", "Упарты прынц" і інш.

Наш госць шмат расказваў пра тое, як складаюцца казкі, колькі ў яго гэта займае часу. Цікава, што самым хуткім быў час напісання — адна гадзіна. А яшчэ ён гаварыў пра тое, што падштурхоўвае яго пісаць казкі. Але, як і ў кожнага пісьменніка, у А.З.Караленкі існуе шмат праблем і цяжкасцей. У самым пачатку творчай дзейнасці, як паведаміў Анатоль Захаравіч, яго казкі не друкавалі па той прычыне, што яны былі напісаны на рускай мове. Ды і зараз, на жаль, з гэтым не ўсё гладка.

Усяго ім было напісана 74 казкі, зараз рыхтуецца зборнік пад назвай "Чорнае золата". З 35 казак пра нафту туды ўвайшлі "Нафта і град", "Марскі ўладальнік", "Залатыя кольцы", "Чарадзейны ручай", "Родная зямля" і інш.

Напрыканцы сустрэчы Анатоль Захаравіч чытаў свае казкі, вершы, ды і ўвогуле здзівіў студэнтаў і выкладчыкаў тым, што заспяваў свае песні. Апладысментам не было канца. Сустрэча пакінула вельмі прыемнае ўражанне, бо кожны з нас уявіў сябе зноў маленькім чалавечкам, успомніў прыгожую пару жыцця — дзяцінства.

Хочацца выказаць падзяку намесніку дэкана філалагічнага факультэта Л.П.Кузьмічу, які арганізаваў гэтую сустрэчу, і выкладчыкам, што не пашкадавалі сваіх заняткаў для правядзення гэтай сустрэчы.

**Ірына ПЯТРУК,**
**студэнтка гр.Б-31**
**філалагічнага факультэта.**

*Пераднавагодні роздум*

## ШТО ВОЗЬМЕМ З САБОЮ Ў БУДУЧЫНЮ?..

Напярэдадні Новага года кожны з нас чакае чагосьці незвычайнага, цудоўнага і абавязкова прыемнага. І, здаецца, не верым ужо ні ў сапраўднасць Дзеда Мароза, ні ў чараўніц, ні ў фей, а прыходзіць 31 снежня — і сэрца замірае, чакаючы: а раптам?..

Гэтак разважала я, вяртаючыся дамоў з сяброўкай пасля чарговага студэнцкага дня. І тут незнарок мой позірк спыніўся на кветкавым базарчыку.

— Уяві, — заўважыла я сяброўцы, — як, мабыць, прыемна і рамантычна атрымаць у навагоднюю поўнач гэтакі агнявы букет руж. Думаю, што гэта будзе лепш за якінебудзь фен або шампунь.

— Ну, ты непапраўны рамантык, — засмяялася сяброўка, — гэта цяпер не ў модзе. Якія яшчэ кветкі? Балычок, каўбаска — вось гэта падарунак: смачна і, галоўнае, карысна. А што кветкі? Завянуць, і як і не было іх.

Я прамаўчала. Ведала, што сяброўка жартуе. Але са шкадаваннем разумела, што ў наш час рамантыкаў сапраўды сустракаецца ўсё меней. А згадзіцеся, у нашым нярэдка няўтульным свеце тысячы людзей мараць аб Цеплыні і Пяшчоце. І вось тая худзенькая дзяўчына каля кіёска, і задуменны малады чалавек, і пануры стары ў падземным пераходзе. Усім трэба ведаць адно: што іх кахаюць, чакаюць і разумеюць, што на гэтай зямлі знойдуцца людзі, здольныя адагрэць іхнія сэрцы і падараваць хвіліны Шчасця і Утульнасці.

Дзве тысячы год чалавецтву... І ўсе гэтыя доўгія гады нярэдка Адзінота і Развітанне кіравалі жыццёвым балем. XXI стагоддзе дае нам магчымасць азірнуцца назад і, адчыняючы дзверы ў новае жыццё, узяць з сабою толькі неабходнае: Веру ў людзей, Надзею на шчасце, і, канешне, рамантычнае Каханне, адным з галоўных атрыбутаў якога з'яўляюцца гэтыя ганарлівыя ружы. І няхай у нас безліч праблем, галоўнае зараз, што мы жывём! Мы вучымся даражыць кожнай хвілінкай жыцця! Мы кахаем! І ў нас хутка такое цудоўнае свята! Мы будзем усміхацца, крышку хвалявацца аб тым, што прынясе нам 2000-ы год. Будзе смех. Будуць букеты віншаванняў, падарункаў, усмешак і, канешне, руж. І хочацца верыць, што ў навагоднюю ноч кожны ператворыцца ў гэткага рамантыка для сваіх каханых і дарагіх людзей...

*З Новым годам, сябры!*

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка гр.РБ-23**
**філалагічнага факультэта.**

# В ЧЕМ ВСТРЕЧАТЬ НОВЫЙ ГОД?



## ЧТО ГОВОРЯТ АСТРОЛОГИ

Дракон – существо весьма оригинальное. Это единственный символ, которого в природе не существует, он лишь плод нашего богатого воображения и непременный атрибут карнавала. А где карнавал, там маски, розыгрыши, переодевания. Девиз: "Чем нелепее одеяние, тем Дракону милее". Если вы вдруг обнаружите где-нибудь в недрах гардероба вещь, надеть которую в реальной жизни не рискнете никогда, смело превращайте ее в новогодний туалет.

Дракон – знак мужской, поэтому очень уместно будет смотреться мужской костюм на хрупком женском теле (или наоборот, если у мужчины хватит смелости облачиться в платье). В качестве компромисса можно позаимствовать у мужа или приятеля только аксессуары – галстук, запонки, сорочку или подтяжки. И отказаться от блузочки или платьица, изобилующего всякими рюшечками, бантиками, оборочками и прочими финтифлюшками. Дракон (как истинный мужчина) больше любит простоту покроя и форм.

Дракон – это змея с крылышками, пусть и выдуманная. Поэтому для новогодней ночи можно выбрать костюм из кожи или латекса, блестящий, переливающийся, словно змеиная шкурка, и сексуально облегающий ваши формы. А так как он еще и огнем периодически поплевывает, в костюм можно добавить красные или оранжевые акценты: яркий шарфик, отделку на платье и т.д.

Дракон не просто сказочный персонаж, он делом занимается – подземные сокровища охраняет. Поэтому в новогоднюю ночь вынимайте из шкатулки все, что есть, и надевайте на себя. Это ничего, что вы составите достойную конкуренцию новогодней елке. Зато Дракон обратит на вас самое пристальное внимание и весь год будет охранять.

## ЧТО ГОВОРИТ РОССИЯ

Дизайнер Виктория Андреянова предлагает основное внимание обратить на аксессуары – и дешево, и эффектно.

В чем встречать Новый год? Конечно, в платье, нежном и трогательном. Это может быть платье-комбинация, но обязательно в комплекте с пуховым платком или мохеровым шарфом. Это может быть платье из шелковой ткани типа тафты или из другой "торчащей" ткани.

Прибавит пафоса наряду шарф-палантин из той же ткани или двойной шарф. Его можно снабдить карманчиками на концах: получится мило и функционально (будет, куда спрятать подарочек).

Если вам некогда задуматься о новогоднем наряде сейчас, вспомните о шарфике хотя бы за сутки до боя курантов.

**("Аргументы и факты".)**



## ПЯТЬ СПОСОБОВ ВСТРЕТИТЬ РОЖДЕСТВО И НОВЫЙ ГОД

*Рождество — один из самых любимых праздников во всем христианском мире. На улицах крупных европейских городов уже задолго до него стояли рождественские елки, в витринах магазинов — рождественские украшения, а в самих магазинах — рождественские скидки. Мы, конечно, еще не Европа, но задуматься над тем, как сделать Рождество и Новый год незабываемыми и неповторимыми, стоит. Рождество в Европе и Новый год у нас, утверждает газета "Комсомольская правда", считаются семейными праздниками, но, во-первых, и для собственной семьи можно придумать что-нибудь непохожее на традиционное сидение за домашним столом вокруг гуся с яблоками, а во-вторых, традиции тем и хороши, что их можно изредка нарушать.*




### Способ первый, РОМАНТИЧЕСКИЙ

Подходит больше для встречи Нового года. Заказываете легковой автомобиль (можно автобус – все зависит от количества участников праздника) на два-три часа с 23.00. Само собой, придется раскошелиться на двойной, если не тройной тариф. Объезжаете город, разглядывая праздничную иллюминацию и выпивая по глотку шампанского у любимых памятников архитектуры. Заезжаете к друзьям с мелкими сувенирами и пожеланиями счастья. Можно остаться праздновать у тех, кто будет наиболее радушен.

### Способ второй, ФЕЙЕРИЧЕСКИЙ

Закупаете большую сумку бенгальских огней, петард, хлопушек, ракет, свечей, огненных фонтанов и прочих пожароопасных удовольствий. Тепло одевшись и взяв с собой некоторое количество еды и питья, отправляетесь, скажем, в лес или на берег реки и устраиваете небольшой шабаш. Сумма затрат зависит от темперамента и масштабов замышляемого зрелища.

### Способ третий, ЗАГОРОДНЫЙ

Уезжаете на три дня в близлежащий центр отдыха. Можно включить в программу и пункт второй (смотрите выше). Не исключен также заплыв. Без заплыва обойдется долларов в 30-70, при купании надо накинуть на лекарства.

### Способ четвертый, ТУРИСТИЧЕСКИЙ

Решительно сказав "Нет!" праздничному многочасовому стоянию у плиты и постпраздничному – у горы грязной посуды, вы убеждаете родных и близких, а заодно друзей "хоть раз в жизни погулять по-человечески". Другими словами, встретить праздник в какой-нибудь заграничной стране со сказочными традициями.

Сразу оговоримся: Новый год в Европе – праздник второстепенный по сравнению с Рождеством. Именно Рождество – кульминация года.

К примеру, в Англии самое главное рождественское блюдо – жареная фаршированная индейка. У каждого повара есть свой рецепт фарша.

В Германии рождественская атмосфера ощущается с самого начала декабря. За четыре недели до Сочельника в окнах домов и в холлах учреждений появляются нарядные венки из хвойных ветвей с четырьмя свечами. В каждое воскресенье декабря зажигают по одной свече, символизируя таким образом приближение Рождества. Главное место на праздничном столе занимает знаменитый на весь мир жареный гусь, фаршированный яблоками с черносливом или изюмом.

Франция расцветает гирляндами огней еще в ноябре. Гордость французов – особый "наряд" для Эйфелевой башни. В этом году, например, было решено превратить ее в огромный цветок. Еще одна французская национальная гордость – паштет из печени специально откормленных гуся или утки, подаваемый на поджаренных хлебцах.

В Польше и Чехии в рождественском меню главное место занимает жареный карп, а на сладкое подается сдобное рождественское печенье.

Но, честно говоря, с шедеврами европейских рождественских кулинарных традиций все-таки лучше всего познакомиться на практике. А заодно ощутить на себе прочие прелести европейского Рождества.

В Европе Новый год – это шумный городской праздник, и весь народ от мала до велика выходит на улицы. Ни в одной европейской стране он не обходится без фейерверков шампанского, которым под бой часов и поздравления поливают всех и вся. Считается, что больше всего новогодних развлечений в Италии и Бразилии и в других экзотических странах. Ведь это Новый год летом, но такое удовольствие недешево.

### Способ пятый, НОВЫЙ РУССКИЙ

Идете в казино и делаете ставки с 23.30. до 0.30. Стоимость удовольствия зависит от азарта и везения, но не следует брать с собой сумму, превышающую ваш месячный заработок. Зато при хорошем раскладе можно будет отложить некоторую сумму и следующий Новый год встретить по четвертому способу.

**Проблема-2000**

## КОМПЬЮТЕР – ТОНКАЯ ШТУЧКА

Новый год не за горами, но, как оказалось, не все западноевропейские страны готовы к решению "Проблемы-2000".

Хуже всех подготовились к смене даты Италия и Испания, а наиболее уязвимыми оказались компьютерные системы итальянских больниц. Серьезные проблемы могут также возникнуть на греческих островах, которые столь популярны среди туристов. Лучше прочих европейских стран к встрече Нового года подготовлены компьютеры в Швейцарии и Германии, где эксперты не ожидают крупных сбоев ни в одной из отраслей экономики. И все же в Германии продолжают проводить профилактические испытания. Так, Dresdner Bank и Франкфуртская биржа смоделировали наступление 2000 года, и никаких сбоев не произошло.

Правда, по мнению специалистов, определенная доля риска остается, в связи с чем руководство немецкой железной дороги решило не испытывать судьбу и в новогоднюю ночь приостановить движение поездов на всей территории Германии.

Меры предосторожности собираются ввести и в других странах: руководство Центрального банка Китая решило 31 декабря отключить в стране все банкоматы, а правительство Японии порекомендовало гражданам на всякий случай запастись перед Новым годом продуктами питания, залить полные баки бензина и заранее снять в банках наличные деньги, которых должно хватить на два-три дня.

**Улыбнитесь!**

## ТОЛКОВЫЙ СЛОВАРЬ ДЕДА МОРОЗА



***Кто как напивается:***

Плотник – в доску. Стекольщик – вдребезги. Извозчик – в дугу. Сапожник – в стельку. Портной – в лоскуты. Пожарный – в дымину. Свинарка – до поросячьего визга. Охотник – в дупель. Шофер – в баранку. Железнодорожник – в дрезину. Футболист – в аут. Повар – в сосиску. Лесник – в шишку. Музыкант – в дудку. Электрик – в отключку. Математик – в ноль. Физкультурник – в лежку. Медик – до потери пульса. Физик – до потери сопротивления. Химик – до выпадения в осадок. Журналист – до точки.

**Наука**

## НУ ОЧЕНЬ МАЛЕНЬКИЙ СКАНЕР

Израильская компания "WizComTechnologies" разработала сканер размером с авторучку (15 сантиметров), способный запомнить до одной тысячи страниц текста. Сканер "Quicklink Pen" весит 85 граммов и, по мнению разработчиков, будет очень полезен студентам и ученым, которые работают в библиотеках и сканируют тексты выборочно, да и вообще для всех, кто торопится. Он совместим с любым персональным компьютером, распознающим код ASCII.

**З міжнароднай канферэнцыі**

## А ЗДАРОЎЕ ПАГАРШАЕЦЦА...

У Мінску на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Здароўе студэнцкай моладзі: дасягненні навукі і практыкі на сучасным этапе".

Дакладчыкі канстатавалі, што ў 1995 годзе ў Беларусі было 50,2% здаровых студэнтаў, а ўжо праз тры гады іх колькасць скарацілася да 30%.

У нашым універсітэце больш 20% студэнтаў аднесены да спецыяльнай медыцынскай групы, якія маюць пэўныя адхіленні ў стане здароўя. Гэтаму садзейнічаюць і неспрыяльныя экалагічныя фактары, і невыкананне рэжыму вучобы і адпачынку, малакаларыйнае харчаванне і інш.

Вось чаму вучоныя і практыкі фізічнай культуры з Польшчы, Украіны, Расіі і іншых гарадоў Беларусі б'юць трывогу і хочуць, каб гэтыя праблемы разглядаліся і вырашаліся на ўрадавым узроўні.

На канферэнцыі былі тры даклады нашых выкладчыкаў (В.А.Каляды, В.А.Харытошкіна і аўтара гэтых радкоў), якія выклікалі пэўную цікавасць у слухачоў.

На жаль, ніводнага даклада не было прадстаўлена на канферэнцыі факультэтам фізічнай культуры ГДУ. Няўжо здароўе студэнтаў не хвалюе яго выкладчыкаў?

**В.МАРЧАНКА.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— эканамічных тэорый — прафесара (1,5);

— хіміі — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.

Тыраж 1.000 экз.

Заказ 638.

Падпісана да друку 27.12.1999 г.